Заключнае слова мае Старшыня СНК БССР—тав. **Галадзед.** (Бурныя апладысменты).

**Галадзед.** Таварышы! У спрэчках па адчоту ўрада выступіла 78 дэлегатаў з'езда.

Усе аратары ў сваіх выступленнях пацвердзілі тыя поспехі рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных БССР, аб якіх я вам гаварыў у сваім дакладзе.

Усе выступаўшыя дапаўнялі мой даклад і прыводзілі рад яркіх прыкладаў і фактаў работы і жыцця паасобных раёнаў, заводаў, калгасаў і соўгасаў.

Гэта сведчыць аб тым, што як уся выбарчая кампанія саветаў, якую мы праводзілі, так і работа нашага з'езда праходзіць вельмі актыўна. Яна гаворыць аб уздыме актыўнасці і аб жывой цікавасці мас да той работы, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве. І гэта тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што **работа нашага совецкага ўрада ёсць работа шырокіх працоўных мас—рабочых на фабрыках, на заводах, калгаснікаў—на калгасных палях.**

Таму, таварышы, у мяне няма патрэбы спыняцца на выступленнях паасобных аратараў, бо ніхто з выступаючых не абвяргаў ні тых вынікаў работы ўрада, аб якіх я дакладваў, ні тых асноўных задач, якія пастаўлены мной у дакладзе. Гэта ў сваю чаргу дае мне права думаць, што дзейнасць урада БССР за адчотны перыяд XI Усебеларускі з'езд саветаў адобрыць. (Апладысменты.)

Таварышы, не толькі на з'ездзе, але і на фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах ідуць спрэчкі па адчоту ўрада БССР. Даклад урада разам са з'ездам абмяркоўваецца тысячамі і тысячамі рабочых і калгаснікаў. Больш 4 тысяч чалавек на фабрыках і заводах Віцебска выказаліся па адчоту ўрада БССР. Выпушчана больш 640 аднадзённых фабрычных газет, прысвечаных завочным спрэчкам з рознымі практычнымі вельмі цікавымі прапановамі. Такое-ж абгаварэнне адчота ўрада праходзіць у Менску на фабрыках і заводах, на кватэрах рабочых. Таксама і ў іншых гарадах і калгасах Беларусі.

Як бачыце, таварышы, рабочыя і калгаснікі адначасова з намі шырока абгаварваюць даклад аб дзейнасці ўрада БССР, уносяць сотні вельмі цікавых прапаноў, якія мы разбярэм і, безумоўна, улічым у далейшай рабоце ўрада. Многія рабочыя адначасова з прапановамі бяруць на сябе новыя абавязкі. Многія працоўныя аднаасобнікі ў адказ на нашы поспехі ўступаюць у калгасы. Гэта гаворыць аб тым, што рабочы клас з кожным днём знаходзіць і паказвае ўсё новыя і новыя метады работы, усё новыя і новыя формы свайго ўдзелу ў будаўніцтве соцыялізма і непасрэдна ў рабоце ўрада БССР. Гэта гаворыць аб цеснай сувязі самых шырокіх рабочых і калгасных мас з урадам

і ўрада з гэтымі масамі. Гэта гаворыць і аб тым, што на грунце гэтай актыўнасці мас у нас ёсць поўная магчымасць усе задачы, якія намечаны перад намі планам 1935 года і планам другой пяцігодкі, выканаць своечасова, добраякасна і з вялікімі поспехамі.

Я не ў сілах зараз у сваёй заключнай прамове даць адказы на тыя прапановы і заўвагі, якія зроблены рабочымі фабрык і заводаў Менска, Віцебска і іншых гарадоў у завочных спрэчках. Але я магу заявіць, што яны, безумоўна, будуць сабраны і ўлічаны ў далейшай рабоце ўрада з тым, каб іх цалкам і поўнасцю ажыццявіць.

Таварышы, характэрнай рысай спрэчак на з'ездзе і спрэчак на фабрыках і заводах з'яўляецца тое, што ніводнага чалавека не знайшлося, які-б адмаўляў тыя поспехі, з якімі прышлі рабочыя і калгаснікі Беларусі на свой XI з'езд советаў.

Гэтыя поспехі агромны, але адначасова перад намі стаіць і многа новых і вялікіх задач, якія патрабуюць ад нас далейшай напружанай, энергічнай работы. Мы не павінны супакойвацца на гэтых поспехах і тым больш мы не павінны зазнавацца нашымі дасягненнямі. Аб гэтым не раз вучыў нас наш настаўнік тав. Сталін.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы